**А. І. Смолік,** *загадчык кафедры культуралогіі,доктар культуралогіі, прафесар*

# ВЫКЛАДАННЕ САЦЫЯГУМАНІТАРНЫХ ДЫСЦЫПЛІН ЯК ФАКТАР ДУХОЎНАГА РАЗВІЦЦЯ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ

У пачатку XXI ст. узмацняецца тэндэнцыя крызісу культуры, што праяўляецца ў пераваze каштоўнасных установак цывілізацыі як супрацьлеглага культуры тыпу грамадскага ўладкавання. На першы план выходзяць каштоўнасці спажывання, асноўнымі ініцыятарамі і стваральнікамі якіх з’яўляюцца буйныя міжнародныя карпарацыі з іх татальнай арыентацыяй на стымуляванне попыту. Але адваротным бокам гэтага пераможнага шэсця цывілізацыі становіцца духоўная дэградацыя. Адбываецца пераход да цывілізацыі, заснаванай на каштоўнасцях аўтаноміі, спажывання і геданізму). Наступствы такога пераходу выражаюцца ў прыярытэце рацыянальных рэгулятараў (розум, закон) над маральнымі (сумленне, маральная адказнасць), што вызваляе ад усялякай адказнасці як вытворцаў, так і іх спажыўцоў. У выніку ў грамадстве назіраецца ўзрастанне сацыяльна-негатыўных дэвіяцый (амаральныя ўчынкі, п’янства, наркаманія, суіцыд, злачынствы і інш.). Па даных крымінальнай статыстыкі рэспублікі, у Беларусі ў 2008 г. у параўнанні з 1990 г. зарэгістраваная агульная злачыннасць павялічылася ў 2,3 разы (у 1990 г. – 75 699, а ў 2008 г. – 158 506 злачынстваў). Сярод краін СНД Беларусь па ўзроўні зарэгістраваных злачынстваў займае 2-е месца пасля Расіі. Штогод рост злачынстваў павялічваецца на 8%. Да крымінальнай адказнасці прыцягнута 73 тыс. чал. Наша краіна наблізілася да сусветнага крытычнага ўзроўню злачыннасці [1, с. 71–72]. Акрамя злачынстваў, актуальнай сацыяльнай праблемай з’яўляецца алкагалізацыя насельніцтва. За апошнія 18 гадоў узровень спажывання алкаголю павялічыўся з 5,7 літра да 12, 4 на душу насельніцтва (рэальны ўзровень 16 літраў). 83 % навучэнцаў і студэнтаў з’яўляюцца актыўнымі спажыўцамі алкаголю. Гэта перавышае ў 2 разы еўрапейскі ўзровень. Сусветная арганізацыя аховы здароўя вызначыла, што пасля 8 літраў наступае крытычны ўзровень, калі пачынаецца эканамічная, культурная і дэмаграфічная дэградацыя грамадства [1, с. 72–73].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дастаткова шырокае распаўсюджанне набыло ўжыванне наркотыкаў. Іх спажыўцамі з'яўляюцца пераважна маладыя людзі ва ўзросце 16–24 год (74%). Сярод наркаманаў: навучэнцы ПТУ – 22%, тэхнікумаў і каледжаў – 17, школьнікі – 15, студэнты – 8, беспрацоўныя – 6 % [1, с. 74].

Такім чынам, чалавек XXI ст. фарміруецца масавай культурай, якая аперыруе прымітыўнымі, прамалінейнымі і нярэдка агрэсіўнымі знакамі і сімваламі, якія праз апеляцыю да форм архетыпічных станаў пераўтвараюць свет чалавека і яго самога. У выніку фарміруецца новы ідэал чалавека, які ідзе па жыцці аўтаномна, з аглядкай толькі на асабістыя інтарэсы, каб з дапамогай спажывання дасягнуць адзіна значных для яго геданістычных мэт. Гэта яўна выражаны тып носьбіта масавай свядомасці, абмежаваны, прагматычны, самаўлюбёны, зямны, пачуццёвы, зарыентаваны цывілізацыяй на спажывальніцтва.

Адказ на пытанне, якім будзе ўрэшце рэшт «новы» чалавек сённяшняга беларускага грамадства, залежыць ад здольнасці нацыянальнай культуры ў глабалізуючымся свеце адстойваць свой унікальны вобраз і тварыць «па вобразу і падабенству». Зварот да этнанацыянальных каштоўнасцей, іх пераасэнсаванне могуць стаць асновай для актывізацыі механізму ідэнтыфікацыі ў рамках сацыякультурнай пераемнасці за кошт з'яўлення ў соцыуме рэферэнтаў – носьбітаў духоўных каштоўнасцей. Важнейшую ролю ў фарміраванні такіх духоўных рэферэнтаў належыць гуманітарным ВНУ, у тым ліку і ўніверсітэту культуры і мастацтваў.

Праўда ёсць меркаванні асобных педагогаў, што сучасныя адукацыйныя стандарты, тыпавыя вучэбныя планы, скарачэнне тэрміну навучання абмяжоўваюць дзейнасць педагагічных калектываў, скіраваную на напаўненне педагагічных стасункаў вышынёй інтэлектуальнага пошуку і духоўнасцю. Безумоўна, выключэнне з вучэбных планаў такіх дысцыплін, як сусветная і айчынная мастацкая культура, культуралогія, скарачэнне гадзін на іншыя сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны абмяжоўвае пэўным чынам выхаваўчыя магчымасці педагогаў вышэйшай школы. У прыватнасці, актыўнае выкарыстанне ў адукацыйным працэсе мастацтва, культуры садзейнічала б таму, што вышэйшыя духоўныя каштоўнасці, пранікаючы ў свет думак і пачуццяў, хутчэй трансфармаваліся б у перажыванні высокага духоўна-маральнага парадку, стымулявалі б цікавасць да пазнавальнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але ўсе вузаўскія вучэбныя дысцыпліны (гуманітарныя, прыродазнаўчыя, спецыяльныя) утрымліваюць пэўны духоўна-маральны патэнцыял, знітаваны з трыма сферамі духоўнай дзейнасці – пазнанне, мастацтва, маральнасць. Гуманітарная праграма, па нашым меркаванні, вымяраецца не наборам разрозненых дысцыплін, а ўяўляе сабой цэльны, стройны, паэтапна раскрываемы ў працэсе выкладання працэс, які павінен дапамагчы студэнту пазнаць свет у вобразах Ісціны, Дабра і Прыгажосці. У сувязі з гэтым, нам падаецца, важна знайсці культурны кансенсус паміж прафесійнай і агульнагуманітарнай адукацыяй. І хаця, як заўважыў Э. Трольч, «супрацьпастаўленне навук аб прыродзе навукам аб духу – бессэнсоўна», усё ж аднаўленне адзінства гэтых раздзеленых структур – вельмі складаная задача [4, с. 556]. Справа ў тым, што здольнасць выкарыстоўваць гуманітарны падыход да пэўнай прафесійнай дзейнасці ў значнай ступені ўплывае на рысы і характарыстыкі прафесійнай культуры спецыяліста, структурным элементам якой з’яўляецца сацыякультурная кампетэнтнасць.

Аналіз зместу апошняга пакалення адукацыйных стандартаў і вучэбных тыпавых планаў дае падставы сцвярджаць, што ў іх закладзена магчымасць фарміравання ў студэнтаў прафесійнай культуры, якая адэкватна сучаснаму стану тэхнагеннай цывілізацыі. Маецца на ўвазе наяўнасць у вучэбных планах абавязковых блокаў дысцыплін: цыклаў сацыяльна-гуманітарных, прыродазнаўчых і агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін. Засваенне дысцыплін дадзеных блокаў стварае перадумовы фарміравання прафесійнай культуры будучага спецыяліста, якая прадугледжвае падначаленне прафесійнай дзейнасці каштоўнасна-нарматыўным сацыякультурным прыярытэтам.

Безумоўна, вядучую ролю ў фарміраванні, трансляцыі базавых культурных каштоўнасцей, светапоглядных ідэалаў і норм адыгрываюць культуралагічныя дысцыпліны: тэорыя і гісторыя культуры, прыкладная культуралогія, сусветная і айчынная мастацкая культура і інш. Культуралагічныя веды ў дадзеных вучэбных дысцыплінах паўстаюць як веды аксіялагічныя ў кантэксце інтэрпрэтацыі культуры як рэгулятыўна-нарматыўнай галіны чалавечай жыццядзейнасці. Каштоўнасці побач з нормамі, узорамі, ідэаламі – важнейшыя кампаненты гэтай рэгулярнай сістэмы. Каштоўнасці з’яўляюцца адной з фундаментальных праблем для культуралагічнага навуковага пазнання. У ім праблема каштоўнасцей займае асобае месца, перш за ўсё ў сувязі з шырока

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распаўсюджаным разуменнем культуры як сукупнасці ўсіх каштоўнасцей, якія стварыла чалавецтва. Павышаны інтарэс да праблемы вывучэння студэнтамі каштоўнасцей тлумачыцца ў сучасных умовах духоўным крызісам, ломкай сфарміраваўшыхся і існаваўшых шмат дзесяцігоддзяў каштоўнасцей савецкай культуры, пошукам новых культуралагічных асноў і каштоўнасных арыентацый постсавецкага грамадства.

Шырокая магчымасць разгледзець генезіс і гістарычныя этапы развіцця беларускай нацыянальнай культуры, выявіць уласную логіку яе дынамікі, самабытнасць, духоўна-маральны патэнцыял маецца у працэсе выкладання гісторыі Беларусі. Разглядаючы палітычную гісторыю беларускага народа ў кантэксце сусветнай гісторыі, можна таксама ахарактарызаваць культурныя працэсы, якія адбываліся ў Беларусі, у цеснай сувязі з аналагічнымі з’явамі, што мелі месца ў суседніх краінах, а таксама ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе.

Фарміраванне сістэмы ведаў аб культуры ў будучых спецыялістаў адбываецца на лекцыях і семінарскіх занятках па філасофіі. Агульная філасофія звязана з культуралогіяй праз філасофію культуры, што вывучае ментальныя характарыстыкі асобы чалавека як прадстаўніка пэўнай культуры і як своеасаблівую «канфігурацыю», складанае «перакрыжаванне» мноства культур.

Значны аб’ём гадзін у тыпавых вучэбных планах адведзены на вывучэнне сацыялогіі (54 гадзіны). У межах дадзенага курса прадстаўляецца мажлівасць азнаёміць студэнтаў з сацыякультурнымі працэсамі і з’явамі, створанымі людзьмі цягам іх сумеснага жыцця, – аб’ектываваным чалавекам у формах яго сацыяльнай практыкі. Выкладчыку не патрэбна тлумачыць, што такое культура, а неабходна сканцэтраваць намаганні на высвятленні, якім чынам можна пазнаць культуру, якую ролю адыгрывае культура ў рэгуляванні сацыяльных працэсаў. Такім чынам, сацыялогія дазваляе студэнту выявіць суадносіны паміж нормай і рэальнасцю, спасцігнуць механізм рэалізацыі каштоўнасных арыентацый і ролі ў жыцці грамадства, дынаміку і фактары культурных змен, уплыў культуры на сацыяльныя працэсы і розныя бакі жыцця грамадства.

Абавязковым кампанентам 3-га блока вучэбных планаў з’яўляецца псіхалогія. У працэсе яе выкладання можна разглядаць асобу як стваральніка і спажыўца культуры, пазнаёміць студэнтаў з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

механізмамі сацыялізацыі і інкультурацыі асобы, прасачыць генезіс чалавечай індывідуальнасці ў культурнай прасторы. У межах псіхалогіі магчыма ажыццяўляць абагульненне з'яў сістэмнага парадку, які акцэнтуе намаганні на працэсе сацыякультурнага выхавання асобы студэнта. Думаецца, правамерна вылучыць такі ўзровень псіхалагічных абагульненняў, як крэатыўная (інавацыйная) дзейнасць сучаснага спецыяліста, здольнасці яго да творчай дзейнасці, выхаду за межы жорсткіх нарматыўна-рэгулятыўных стэрэатыпаў свядомасці і паводзін.

Пэўныя культуралагічныя веды студэнты могуць атрымаць на лекцыях і практычных занятках па паліталогіі, эканамічнай тэорыі і іншых гуманітарных вучэбных дысцыплінах, якія садзейнічаюць пазнанню культурнага сэнсу таго віду прафесійнай дзейнасці, да якой падрыхтоўвае студэнта ВНУ. Адукацыйны стандарт апошняга пакалення ўтрымлівае абавязковы кампанент, які складаюць прыродазнаўчыя дысцыпліны. На наш погляд, выкладанне абазначаных дысцыплін неабходна пабудаваць так, каб прыродныя працэсы разглядаліся не ў адрыве, а ў цеснай узаемасувязі з пазнаючым суб'ектам, г.зн. чалавекам. «Людзі і тэхніка, патрэбнасці і рэчы, – адзначаў Ж. Бадрыйяр, – узаемна структурыруюць адзін аднаго – да лепшага ці горшага» [2, с. 104]. Культуралагічны кантэкст прыродазнаўчых і тэхнічных навук выразна яшчэ ў XIX ст. абазначыў В. Гумбальдт, які трактаваў культуру як панаванне чалавека над прыродай, якое ажыццяўляецца з дапамогай навукі і рамёстваў [3]. Як вядома, культуролагі, кіруючыся матэрыялістычным разуменнем гісторыі, падзяляюць культуру на дзве формы: матэрыяльную і духоўную. Такім чынам, пры выкладанні цыкла прыродазнаўчых дысцыплін маецца магчымасць раскрыць студэнтам матэрыяльныя ўтварэнні культуры.


1. *Барановский, Н. А.* Социально-негативные девиации и стратегии антидевиантной политики / Н. А. Барановский // Социологический альманах. – Минск : Беларус. навука, 2010. – Вып. 1. – С. 68–76.

2. *Бодрийяр, Ж.* Система вещей / Ж. Бодрийяр. – М. : Рудомино, 1995. – 186 с.

3. *Гумбольдт, В.* О различии строения человеческих языков и его влиянии на духовное развитие человеческого рода / В. Гумбольдт // Избранные труды по языкознанию. – М. : Прогресс, 2001. – 298 с.

4. *Трёльч, Э.* Историзм и его проблемы. Логическая проблема философии и истории / Э. Трёльч. – М. : Юрист, 1994. – 719 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ